Радыё “Свабода”

19.09.2018

# На біблейскай выставе можна будзе надрукаваць сабе асобнік на станку часоў Гутэнбэрга

Алесь Пілецкі




Канвалют Біблії Скарыны, фота з сайта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі
Падзяліцца

**Над тым, каб прывезьці ў Беларусь больш за 200 унікальных экспанатаў, арганізатары працавалі цэлы год.**

20 верасьня ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі адчыняецца выстава «Беларусь і Біблія». Арганізатары сьцьвярджаюць, што ўпершыню ў гісторыі краіны ў межах адной выставы апынуцца рарытэты сусьветнай значнасьці, узрост якіх дасягае 5 тысяч гадоў. Старажытныя кнігі і артэфакты ў Менск прывезьлі з прыватных калекцый Вялікай Брытаніі, ЗША, Ізраілю і Карэі.

На выставе «Беларусь і Біблія» можна будзе пабачыць

- арыгіналы гліняных таблічак з клінапіснымі тэкстамі з Ура ўзростам 4–5 тысяч гадоў,
- рукапіс «біблії Антычнасьці» — «Іліяды» Гамэра,
- унікальныя скруткі зь Мёртвага мора (кумранскія рукапісы), якім больш за 2 тысячагодзьдзі,

- самыя старажытныя фрагмэнты Новага Запавету (2–3 стст. н.э.),
- біблейскія рукапісы на старажытных мовах,
- першадрукі многіх народаў і краін,
- першыя пераклады Бібліі на нацыянальныя мовы, а таксама
- арыгіналы Біблій Гутэнбэрга, Лютара і Скарыны.

Акрамя гэтага, пакажуць амаль усе пераклады Бібліі на беларускую мову.

Як расказваюць арганізатары, на выставе будзе працаваць багата аніматараў з розных краін. Усе наведнікі змогуць скарыстацца паслугамі варштату часоў Гутэнбэрга, рукапіснай майстэрні. Для дзяцей арганізуюць заняткі «Клюбу кніжных прафэсараў».

Кніжныя рарытэты ў Беларусь даставілі самалётам з Франкфурту, іх суправаджалі давераныя асобы ўладальнікаў. Большасьць кніг і артэфактаў будуць дэманстравацца ўпершыню. Перамовы па арганізацыі выставы вяліся больш за год. Самыя дарагія экспанаты каштуюць некалькі мільёнаў эўра.

> «Пераважна гэта прыватныя зборы, — сказаў Свабодзе намесьнік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **Алесь Суша**. — Гэта не дзяржаўныя закрытыя калекцыі альбо ўсім добра вядомыя экспанаты сусьветнай значнасьці, гэта унікумы, якія дагэтуль мала хто бачыў. На выставе будзе магчымасьць пабачыць каштоўныя помнікі, якім некалькі тысяч гадоў і якія маюць каштоўнасьць дзясяткі мільёнаў эўра за кожную адзінку. Абсалютна непаўторная, унікальная выстава, я дагэтуль ня веру, што мы маем гэта ў Беларусі. Такая выстава дэманструецца ўпершыню ня толькі ў нашай краіне, а наагул у сьвеце. Нешта падобнае адбывалася толькі аднойчы ў Ганконгу».

Выстава адкрыецца ў чацьвер 20 верасьня. Кніжныя шэдэўры прабудуць у Беларусі месяц. Пасьля Менску частка калекцыі адправіцца ў Расею, дзе будзе экспанавацца ў Эрмітажы.